УДК 271.2(476)(09)

**А.Р. Дзянісава**

# Гаспадарчая дзейнасць праваслаўных манастыроў Беларусі ў другой палове XV – першай палове XVII ст.

Мэта даследавання – разгледзець пытанні гаспадарчай дзейнасці праваслаўных манастыроў Беларусі ў другой палове XV – першай палове XVII ст. На падставе дакументаў вызначаецца маёмасны стан асобных беларускіх абіцеляў. Адзначаецца, што большасць з іх не валодала значнай маёмасцю.

Царкоўная маёмасць – гэта, у першую чаргу, зямля, маёнткі, сельскагаспадарчыя ўгоддзі і інш. Звычайна манастыры і цэрквы атрымлівалі зямлю ў якасці ўклада (дару), радзей – пакупкі. Зямля магла перадавацца як ва ўмоўнае трыманне, так і ў вотчыну. Умоўнае трыманне зямлі было пераважна распаўсюджана ў XI–XIV стст. ва ўладаннях свецкіх феадалаў: абіцелі і цэрквы мелі права не на саму зямлю, а на даходы з яе [1]. Пазней зямельныя ўгоддзі ў асноўным выдзяляліся ва ўласнасць з правам распараджэння.

Як адзначалі А. Мартас і І. Чыстовіч, у Вялікім княстве Літоўскім права праваслаўнай царквы на нерухомую і іншую маёмасць было замацавана каралём Уладзіслававам III у законе 1443 г. [2–3]. Яно было ўнесена ў Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. У адносінах згаданага права каралямі і вялікімі князямі прымаліся і асобныя палажэнні. Так, у 1507 г. кароль Жыгімонт I прызнаў за праваслаўнай царквой магчымасць на набыццё нерухомай маёмасці праз прыжыццёвыя дарэнні прыватных уладальнікаў, а таксама праз тэстаменты. Па гэтым законе патрэбна было, каб кожны тэстамент меў каралеўскае пацвярджэнне [3, с. 208]. Аднак на Берасцейскім сойме 1566 г. апошняе абмежаванне згубіла сваю моц.

З праваслаўных духоўных устаноў Вялікага княства Літоўскага самай значнай маёмасцю валодалі Мітрапаліцкая і Уладзімірская епіскапскія кафедры, Кіева-Пячэрская лаўра. Наогул, першае месца па колькасці ўладанняў займалі епіскапскія кафедры, потым ішлі манастыры, затым – саборныя цэрквы і апошняе месца было за прыходскімі храмамі.

**Маёмасны стан праваслаўных абіцеляў Беларусі ў другой палове XV – першай палове XVII ст.** Пытанне аб маёмасным стане праваслаўных абіцеляў Беларусі ў азначаны перыяд з'яўляецца маладаследаваным. Тым не менш, на прыкладзе асобных абіцеляў можна атрымаць агульнае ўяўленне па згаданай праблеме. Так, напрыклад, адзін з самых старажытных манастыроў Беларусі – Пінскі Лешчанскі – з'яўляўся даволі значным зямельным уладальнікам. У 1340 г. пінскі князь Георгій Нарымундавіч (у А.І. Мілавідава – Юрый Нарымунтавіч) надаў манастыру востраў паміж рэкамі Пінай, Струменем і Ворліцай [4–5]. Гэта наданне лічыцца адным з першых падараванняў названай абіцелі. Аднак дадзены дакумент не захаваўся.

А.І. Мілавідаў сведчыў, што самыя старажытныя дакументы лешчанскага архіва датаваліся пачаткам XVI ст. Гэта былі даравальныя граматы князя Фё-

дара Іванавіча Яраславіча і яго жонкі Алены Сямёнаўны Алелька. Апошнія не шкадавалі на абіцель сродкаў і ўладанняў. Так, у 1514 г. Лешчанскі манастыр атрымаў ва ўладанне ніву, у 1518 г. князёўна Алена Сямёнаўна надала яму дворышча ў в. Вольвічы, у 1520 г. князь Фёдар Іванавіч запісаў пяць азёр [6].

Пасля смерці Ф.І. Яраславіча ў 1521 г. Пінск і Пінскае княства перайшлі ў пажыццёвае ўладанне каралеве Боне. Яна падцвердзіла ўсе прывілеі і запісы, зробленыя на карысць Лешчанскага манастыра [5, с. 6].

У 1552–1555 гг. каралевай было праведзена вымярэнне зямель, якія належалі ёй, у Пінскім і Клецкім княствах. Адна з галоўных задач каралеўскага вымярэння – вызначэнне сялянскіх надзелаў праз іх размежаванне з суседнімі землеўладальнікамі. Зразумела, што пры выкананні гэтай мэты ўлічваліся інтарэсы, галоўным чынам, каралеўскіх сялян. У большасці выпадкаў ад прыватных землеўладальнікаў адыходзілі лепшыя землі, а ўзамен даваліся не вельмі добраякасныя. Вынікі праведзеных аперацый былі зафіксаваны ў пісцовай кнізе, складзенай пінскім старастам Станіславам Хвальчэўскім [7].

Уладанні пінскага праваслаўнага духавенства, у тым ліку Лешчанскага і Варварынскага манастыроў, таксама трапілі пад згаданае размежаванне. Пры раздзяленні каралеўскіх і царкоўных зямель амаль кожная межавая здзелка суправаджалася заўвагай, што ад царквы ўзята лепшая зямля, а ёй дадзена горшая і больш аддаленая. Праўда, пры гэтым духоўным асобам рабілася надбаўка ў некалькі моргаў дрэннай зямлі. К. Снітко лічыў, што праведзенае размежаванне з'яўлялася пачаткам абеззямельвання праваслаўнага духавенства Пінскага княства [7, с. XVI].

Колькі ўсёй зямлі належала праваслаўнаму духавенству ў Пінску і па-за яго межамі, у пісцовай кнізе не вызначалася. У ёй толькі пералічваліся ўчасткі, узятыя ў абмен на землі каралевы. Але нават калі дапусціць, што былі заменены ўсе царкоўныя землі, то і ў гэтым выпадку духавенства з'яўлялася б значным зямельным уладальнікам. Так, толькі архімандрыту Лешчанскай абіцелі было адведзена 5 валок, 2 моргі і 16 прутоў зямлі [7, с. XXVII]. Акрамя гэтага, настаяцелю падпарадкоўваліся сяляне.

Яшчэ адно вымярэнне і размежаванне каралеўскіх зямель, толькі ўжо ў Пінскім старостве, адбылося ў 1561–1566 гг. Праводзілася яно каралём Жыгімонтам ІІ Аўгустам. У новай пісцовай кнізе, складзенай пінскім і кобрынскім старастай Лаўрынам Войнам, адзначалася: «Всех монастырских пляцов 11. Под ними прутов селитебных 27,5. Повинности с них поступают в пользу монастыря» [8]. Адсюль вынікае, што Лешчанскі манастыр меў маёмасць непасрэдна ў г. Пінску.

Далейшыя больш дакладныя звесткі пра маёмасны стан Лешчанскай абіцелі можна атрымаць з інвентара 1588 г. [9]. Па яго дадзеных, на тэрыторыі абіцелі размяшчаліся неабходныя гаспадарчыя пабудовы: стайня, клуня, гумно, адрына («сенник»), бровар. Наяўнасць гэтых пабудоў сведчыла аб тым, што пры манастыры мелася прысядзібная гаспадарка. Дадзенае меркаванне падмацоўваецца яшчэ і тым фактам, што пры абіцелі меліся сад, агарод. Акрамя названага, яна валодала раллёй, сенажацямі, лясамі, а таксама перавозам на р. Стыры каля в. Волвічы. Яна магла карыстацца лесам з усёй «монастырской волости» для ацяплення і будаўніцтва. З усіх «язов» Пінскага замка да стала манастырскай брацііі падавалася дзесятая частка ўлову асятроў. Гэту прывілею манахі атрымалі яшчэ ад Ф.І. Яраславіча ў 1503 г. [6, № 93, с. 295]. Абіцель мела і свае рыбныя ловы.

Па згаданым вопісе, манастыру належалі наступныя ўгоддзі: уся прастора ад ракі да дарогі, што вяла ў манастыр і 1 валока за дарогай насупраць абіцелі; валока «за перетоком», якая прымыкала да зямлі каралеўскага дворышча «Сялец», да «городских шнуров» і Запольскіх межаў; акруга паміж

р. Ворліцай і р. Пінай з азёрамі і лугамі; два гаі з зямлёй і лугамі ў Горнага; луг каля ракі непадалёк ад млына пана Рыгора Войны; пяць азёраў у маёнтку Моталь: Моталь, Жыдзень, Мыльнае, Скупое і Гошчэ; «Большой остров» – лясная дзялянка звыш ста валок непадалёк ад Парэчча.

Акрамя вышэйпералічанага, абіцель валодала прыгоннымі сялянамі. Яны пражывалі ў вёсках: Волвічы, Аўсемерава (ці Аўсемірава), Патапавічы, Сушчыцк, Сухое і Таўровічы. Усяго сялян быў 51 двор. Кожны дзень 5–6 чалавек ад кожнай вёскі прыходзілі ў манастыр на працу. Два разы на год была і агульная работа – талака.

Сяляне плацілі абіцелі грашовую даніну ў памеры 11 коп 24 грошы. Прыгонныя выконвалі і натуральныя павіннасці: 34 «мацы» (1 маца = 0,325 рускага вядра) і 2 «коляды» аўса, 21 вядро мёду, 51 воз сена, 41 штука жывой птушкі (курэй, качароў, вутак), 375 яек.

Наступны вопіс манастырскай маёмасці быў зроблены ў 1620 г., калі абіцель кіравалася В. Сапяжанкай [5, с. 18–21]. Вопіс складзены на імя нейкага пана Лазоўскага. У адпаведнасці з інвентаром ёй па-ранейшаму належалі значныя ўгоддзі і вёскі з сялянамі, акрамя в. Сушчыцк. У межах Пінска манастыр валодаў домам: «…При месте Пинском недалеко от паркану дом сеченьский з пляцом, и з садом, и з огороды, и з сеножатью на врочищу у Божоре межи плечищи» [5, с. 20].

Вёска Сушчыцк, нягледзячы на тое, што не называлася ў вопісе, усё ж такі з'яўлялася манастырскай. Яна ўпаміналася ў 1641 г., калі разбіралася справа аб прычыненні шкоды Лешчанскаму манастыру зямянкай Люцыяй Корсак [10].

Як бачна з інвентароў, Лешчанскі манастыр валодаў даволі значнай маёмасцю, якая забяспечвала яго існаванне. Прыгонныя сяляне, якіх на пачатак XVII ст. налічвалася каля 100 чалавек, неслі павіннасці на карысць абіцелі і выконвалі ўсе сельскагаспадарчыя работы як у манастыры, так і па-за яго межамі [5, с. 6].

Слуцкі Трайчанскі (Троіцкі) манастыр – абіцель, якая стала апорай праваслаўя на Беларусі ў часы уніі. Ён таксама з'яўляўся ўладальнікам пэўнай маёмасці. Першае вядомае наданне манастыру было зроблена ў 1455 г., калі баярын Васіль Цар, з дазволу слуцкага князя Міхаіла Аляксандравіча, купіў «дворец Ивашка Гридковича на Локнеи» і «придал Святей Троици у Слуцку…» [11].

Наогул, Троіцкая абіцель знаходзілася пад патранатам слуцкіх уладарных князёў. У другой палове XV–XVI стст. гэта былі Алелькавічы, якія выдзялялі сродкі на яе ўтрыманне. У 1489 г. княгіня Ганна Слуцкая сваёй граматай даруе абіцелі «став Локнейскый»; у 1492 г. яна дае даравальныя граматы на «чоловека нашого данного Ивана Козича» і на сяло Драбышэўскае [11, № 94, с. 112; № 98–99, с. 113–114].

Далейшыя звесткі аб манастырскай маёмасці можна пачарпнуць з інвентара 1494 г. [11, № 115, с. 136–137]. На жаль, у вопісе не апісваюцца ўсе ўгоддзі, якія лічыліся за манастыром. Затое даецца колькасць харчовых прыпасаў і жывёлы, якая мелася ў гаспадарцы: «А животины: сем волов, а десять коров, а иной животины десятеро. Жита 32 бочки, а немолочоного шестьдесят коп тут, а в Селци стирта сеголетняя сто коп, ечменю сем бочек, гречки шестнадцать бочек, овса пять бочек, пшеницы бочка. Свиней 30, коней роботных четверо, а пятый ноходник вороный. Меду пресного чотыри ушатки…»

З прыведзенага апісання бачна, што ў манастырскай прысядзібнай гаспадарцы гадавалася хатняя жывёла: каровы, свінні і інш. Пры выкананні сельскагаспадарчых работ у якасці цяглавай сілы выкарыстоўваліся коні, верагодна, і валы. Манастыр валодаў ворнай зямлёй, на якой вырошчваліся розныя збожжавыя культуры, сенажацямі, бортніцкімі ўгоддзямі.

Згаданыя сельскагаспадарчыя работы, пэўна, прыходзілі выконваць сяляне. Акрамя гэтага, яны плацілі натуральную даніну і чынш: «…А в людех не взято 28 ведер (мёду. – *А.Д.*), а в пана Зверя три ведра, а в Мордвиновича человека чотыри ведра. А грошей в людех с шесть коп, а на Сверженьских людех 27 грошей, а куници замонастырскии вси; а за рубль за кун Гринец, а Свержанин за копу». Агульная колькасць сялян і вёсак, падначаленых абіцелі, у інвентары не называлася.

У XVI ст. уладанні Трайчанскага манастыра пашыраюцца за кошт новых ахвяраванняў. Абіцель атрымала права на лоўлю рыбы і баброў на р. Арэсе і азёрах Жыд і Вепр. Гэта права было пацверджана Юрыем Юр'евічам Алелькам у 1566 г. [4, с. 113]. 30 сакавіка 1535 г. слуцкі князь Юрый Сямёнавіч запісаў на манастыр в. Пасека з сялянамі [12]. У 1582 г. агульная колькасць вёсак, дзе пражывалі падначаленыя абіцелі сяляне, складала 5: Пухавічы, Рэдкавічы, Шыпялевічы, Ямінск, Вяхшыковічы [13].

Ахвяраванні на карысць манастыра рабілі не толькі князі, але і мяшчане. У 1629 г. жыхар Слуцка Васілій Фёдаравіч Цішэвіч завяшчаў Троіцкай абіцелі фальварак Звярынец, на якім «он имеет записанных 300 злотых польских…» [4, № 42, с. 12].

На манастырскі кошт паступалі таксама і грашовыя ахвяраванні. Так, у 1641 г. князь Багуслаў Радзівіл загадаў, каб кожны год са слуцкага скарбу манастыру выдавалася 40 коп грошаў ці 100 польскіх злотых; у 1659 г. княгіня Марыя, жонка Януша Радзівіла, запісала на абіцель 4000 злотых [4, с. 114].

Трайчанскай абіцелі прыносіла даход выстаўленне ў заставу часткі маёмасці. Архімандрыт Іларыён Дараховіч Балоцінскі, «испытав неудобства и хлопоты при собирании с мещан Троецких, назначенного прежними слуцкими князьями, для сычения 150 ведер меду для Троицкой обители, при чем возникали споры и недоразумения, а посему он отдает в арендное содержание еврею Довиду Якубовичу пивной шинк с плацом, а также «канон медовый благовещенский и Свято-Троицкий» на три года с 1647–1650 по 170 злотых в год». Акрамя гэтага, Д. Якубовіч павінен быў дастаўляць у манастыр 50 фунтаў «чистаго воску» штогод [13, № 81, с. 30]. Дадзены дагавор быў пацверджаны і ў 1654 г.

Улічваючы ўсё сказанае, можна сцвярджаць, што ў XVI – другой палове XVII ст. Трайчанская абіцель валодала значнай маёмасцю, у склад якой уваходзілі вёскі з сялянамі, розныя ўгоддзі – ворыўная зямля, сенажаці, лясы, бабровыя і рыбныя лоўлі. Неблагое матэрыяльнае становішча, падтрымка ўладарных князёў, а таксама прадстаўнікоў мясцовага грамадства далі магчымасць абіцелі захаваць праваслаўе ў сваіх сценах.

Дзве вышэйапісаныя абіцелі мелі статус архімандрыі, таму займалі даволі важнае значэнне ў царкоўнай іерархіі. Да таго ж іх месцазнаходжанне ў гарадах спрыяла таму, што яны былі ў цэнтры ўвагі праваслаўных вернікаў. Аднак і менш значныя абіцелі, якія размяшчаліся як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці, таксама мелі падтрымку насельніцтва.

Так, у 1630 г. Васіль Копец, кашталян Навагрудскі, ахвяраваў Купяціцкай Увядзенскай абіцелі 4 валокі зямлі: 2 размяшчаліся ў в. Купяцічы і 2 – у в. Волька [4, с. 150]. Больш падрабязна маёмасць абіцелі апісваецца ў інвентары 1631 г. [14]. Пры манастыры меліся гаспадарчыя пабудовы: пякарня, піўніца, 2 свіраны, адзін з якіх прызначаўся для захоўвання збожжа, гумно, стадола («stodola») для трымання саломы і малацьбы збожжа. Прысутнасць згаданых будынкаў сведчыла аб тым, што гаспадарчая дзейнасць вялася непасрэдна на тэрыторыі абіцелі.

У гэты ж час манастыру належалі 6 валок зямлі, з іх 4 – аселыя. На аселых («osiadłych») валоках пражывалі манастырскія падданыя, якія выконвалі

павіннасці «адпаведна звычаям» («według zwyczaiów»). Характар павіннасцяў не называўся. За манастыром лічыліся 2 валокі «bez poddanych» (без падданых) у в. Волька, а таксама розныя ўгоддзі: 2 язы (месцы для лоўлі рыбы), сенажаці, лясныя ўгоддзі, з якіх дрэва бралася для ацяплення.

Апекунамі Іаана-Багаслоўскай абіцелі ў Грозаве былі бацька і сын Валадковічы. Яны з'яўляліся будаўнікамі манастырскіх цэркваў. У 1639 г. Р. Валадковіч афармляе фундушавы дакумент [15]. На манастыр былі запісаны Слабодка Цярпілаўка з 6 валокамі і з падданымі (налічвалася 14 душ мужчынскага полу); фальварак («застенок») Каспараўшчызна з 2 валокамі; востраў Дражны з угоддзямі ў Грэзскай пушчы; агарод ад манастыра аж да ракі Вужанкі; Дубяноўскі «став» з млыном.

Фальварак Каспараўшчызна надаваўся з «будованем вшеляким на том застенку побудованым, з сеножатками, борами, лесами, зарослями, з реками речками, з деревом бортным…, и даню медовую, сажавками и зо всими вшелякими… приналежностями и пожитками…» Дрэва з в. Дражны можна было выкарыстоўваць для будаўніцтва і ацяплення. Да ўсяго вышэйпералічанага, манахам дазвалялася даходы з грозаўскіх кірмашоў, якія праводзіліся ў час святаў, «на свои пожиток оборочати».

Кцітар Р. Валадковіч выказаў жаданне, каб інакі сачылі за шпіталем для «убогих», які размяшчаўся каля в. Міхалевічы. Сваім фундушавым запісам ён забяспечваў і шпіталь: «…Маем дават на кождый рок на тот шпитал навыживене жита солянок осм, гречки солянок чотыри, гороху солянка, ечменю солянок чотыри, слонины полти чотыри, соли бочка, а оицове того монастыра дозорцами мают быт того всего» [15, с. 219].

Морацкі Мікалаеўскі манастыр, як вядома, знаходзіўся пад апекай слуцкіх князёў Алелькаў. У 1583 г. князь Ю.Ю. Алелька пацвярджае права манастыра на ўладанне востравамі Зімавішча, Падпятнішча і Малое Зімавішча [16]. Згаданае права было дадзена абіцелі бацькам князя – Юрыем, і адбылося гэта не пазней 1578 г. (год смерці бацькі). Захаваліся звесткі пра тое, што ў 1582 г. Морацкі манастыр валодаў вёскай Меляшкова, а ў 1623 г. – маёнткам Бабінічы (ці Бабінец) [13; 11, спр. 481, с. 37].

Згодна з інвентаром 1627 г., на манастырскай тэрыторыі размяшчаліся бровар і «дворец» – сельскагаспадарчая ферма з жывёлай [13, № 37, с. 10–11]. У в. Ананчыцы манастыру належалі 4 службы, якія складаліся з 8 хат па 0,5 дыму.

Штотыднёва ад кожнай службы па 4 чалавекі павінны былі прыходзіць на манастырскія работы: 12 дзён з сохамі (3 дні па 4 сахі) араць «поранину» і 12 дзён на «мешань». Акрамя гэтага, кожнай службе належыла прывезці па 10 вазоў дроў, перавезці сена, вывезці па 10 вазоў гною і даць 1 падводу для паездкі ў Слуцк.

Сяляне плацілі манастыру натуральную даніну і чынш: з кожнай з 8 хат трэба было аддаць па 1 вядры мёду, па 1 вядры хмелю, 30 грошаў «поплату», па 1 курыцы і 10 яек. «Огородники» асобна плацілі з дыму па 20 грошаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, праваслаўныя абіцелі Беларусі валодалі як рухомай, так і нерухомай маёмасцю. У склад манастырскай маёмасці ўваходзілі землі, маёнткі з сялянамі, якія выконвалі розныя павіннасці, сельскагаспадарчыя ўгоддзі, дамы з пляцамі і інш. Амаль кожная абіцель вяла прысядзібную гаспадарку. Акрамя гэтага, некаторыя манастыры мелі грашовыя сумы, якія складаліся з ахвяраванняў, чыншу, прыбыткаў ад продажу часткі сельскагаспадарчай прадукцыі, здачы ў арэнду зямлі. Асноўная колькасць абіцеляў не была вельмі багатай. Калі ўлічваць той факт, што на тэрыторыі Беларусі праваслаўныя манастыры не былі шматнаселенымі, то можна выказаць меркаванне, што згаданая маёмасць забяспечвала асноўныя патрэбы манахаў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Русская православная церковь. Монастыри.*** – М., 2000. – С. 403.
2. ***Мартос, А.*** Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни / А. Мартос. – Минск, 1990. – С. 153.
3. ***Чистович, И.*** Очерк истории западно-русской церкви: в 2 ч. / И. Чистович. – СПб., 1882. – Ч. 1. – С. 208.
4. ***Архимандрит Николай.*** Историко-статистическое описание Минской епархии. – СПб., 1864. – С. 136.
5. ***Миловидов, А.И.*** Архив упраздненного Пинского Лещинского монастыря / А.И. Миловидов. – М., 1900. – С. 5.
6. ***Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем ВКЛ.*** – Вильно, 1867. – № 91. – С. 294; № 94. – С. 296; № 93. – С. 295.
7. ***Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств.*** – Вильно, 1884.
8. ***Писцовая книга бывшего Пинского староства: в 2 ч.*** – Вильно, 1874. – Ч. 1. – С. 73.
9. ***Довгялло, Д.И.*** Пинский Лещинский монастырь в 1588 г. / Д.И. Довгялло // Минская старина. – 1911. Вып. 2. – С. 97–124.
10. ***Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Даведнік.*** – Мінск–Полацк, 1999. – Спр. 716. – С. 48–49.
11. ***АЗР.*** – СПб., 1846. – Т. 1. № 56. – С. 70.
12. ***Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.*** – Ф. 136. – Воп. 1. – Адз. зах. 1851. – Т. 2. – Арк. 340.
13. ***Тройчанский архив*** // Минская старина. – 1913. Вып. 4. – № 11. – С. 5.
14. ***АВАК.*** – Вильно, 1880. – Т. 11, № 86. – С. 236–240.
15. ***Собрание древних грамот и актов.*** – Минск, 1848. – № 109. – С. 216–220.
16. ***Акты, изд. Виленскою комиссиею для разбора древних актов.*** – Вильно, 1908. – Т. 33, № 92. – С. 96–97.



## *SUMMARY*

*The article considers different sides of economic activities of orthodox monasteries in Belarus in the second part of the XVth – the first part of the XVIIth centuries. According to documents it defines the property of separate Belarusian monasteries and emphasizes that the most of them didn`t have considerable property.*



*Поступила в редакцию 12.04.2006*